# АКЦЫЯ ПІЛЬНАЙ ДАПАМОГІ

## СПЫНІЦЬ ЖОРСТКАЕ АБЫХОДЖАННЕ СА ЗНЯВОЛЕНАЙ ЛІДАРКАЙ АПАЗІЦЫІ

**Улады Беларусі павінны неадкладна і безумоўна вызваліць Марыю Калеснікаву і пакласці канец жорсткаму абыходжанню з ёй. Марыя Калеснікава - вядомая дзеячка апазіцыі і сімвал мірнага пратэсту 2020 года - утрымліваецца за кратамі з верасня 2020 года. Адміністрацыя папраўчай калоніі падвергла Марыю Калеснікаву жорсткаму абыходжанню, і яе здароўе пагоршылася. Ад сярэдзіны лютага ёй адмаўляюць у любых кантактах з сям'ёй і адвакатам, уключаючы званкі, лісты і спатканні.**

**ЗАКЛІКАЕМ ДА ДЗЕЯННЯ: НАПІШЫЦЕ ЎЛАСНЫ ЗВАРОТ СВАІМІ СЛОВАМІ АБО СКАРЫСТАЙЦЕСЯ УЗОРАМ НІЖЭЙ**

*Андрэй Швед*
*Генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь*
*Вул. Інтэрнацыянальная, 22,*
*г. Мінск, 220030*
*Рэспубліка Беларусь*
*Email: info@prokuratura.gov.by*

*Паважаны спадар Генеральны пракурор,*

*Я глыбока занепакоены станам здароўя і асабістай бяспекай вязня сумлення **Марыі Калеснікавай** і патрабую яе неадкладнага і безумоўнага вызвалення.*

*Пасля яе арышту ў форме выкрадання 7 верасня 2020 года, Марыя Калеснікава была асуджаная 6 верасня 2021 года да 11 гадоў турэмнага зняволення паводле сфабрыкаваных абвінавачванняў у "экстрэмізме", "спробе захопу ўлады" і "закліках да дзеянняў, скіраваных на прычыненне шкоды нацыянальнай бяспецы". Марыя Калеснікава адбывае пакаранне ў жаночай папраўчай калоніі N4 у Гомелі, дзе яе здароўе значна пагоршылася. Адміністрацыя турмы неаднаразова карала і пераследавала яе за нібыта дысцыплінарныя парушэнні.*

*Уначы 28 лістапада 2022 года Марыю Калеснікаву шпіталізавалі ў рэанімацыйнае аддзяленне Гомельскай бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі, дзе ёй зрабілі аперацыю ў сувязі з прабадзеннем язвы. Адміністрацыя калоніі 10 студзеня прымусіла яе вярнуцца да працы на швейнай вытворчасці, пазбавіўшы яе магчымасці належным чынам аднавіцца пасля аперацыі. Непасрэдна перад шпіталізацыяй Марыя Калеснікава, нягледзячы на сур'ёзныя праблемы са здароўем, больш за 10 дзён утрымлівалася ў штрафным ізалятары — адзіночнай неацяпляльнай камеры. Там было немагчыма спаць з-за холаду, яна ўвесь час хадзіла, каб сагрэцца" Хоць падчас знаходжання ў адзіночнай камеры Марыя Калеснікава неаднаразова губляла прытомнасць і пакутавала ад гіпертаніі і прыступаў млоснасці, улады адмаўляліся пераводзіць яе ў бальніцу да таго часу, пакуль яе стан не стаў крытычным. Адміністрацыя папраўчай калоніі не паведаміла ні яе адвакату, ні яе сям'і пра тое, што Марыя Калеснікава была шпіталізаваная і перанесла аперацыю, хоць яна шмат разоў прасіла персанал бальніцы звязацца з яе сям'ёй. У траўні 2023 года яе здароўе яшчэ больш пагоршылася.*

*Ад сярэдзіны лютага Марыі Калеснікавай адмаўляюць у любых кантактах з сям'ёй, уключаючы званкі, лісты і спатканні. Адвакат, нягледзячы на неаднаразовыя спробы, ад 7 лютага не можа атрымаць да*

*яе доступ.*

***Я настойліва заклікаю вас:***

- ***Забяспечыць неадкладнае і безумоўнае вызваленне Марыі Калеснікавай;***
- ***Тэрмінова спыніць жорсткае абыходжанне і ўтрыманне Марыі Калеснікавай пад вартай без сувязі са знешнім светам, забяспечыць ёй належную медыцынскую дапамогу і ўсё неабходнае, у тым ліку медыкаменты;***
- ***Аператыўна і эфектыўна расследаваць паведамленні пра жорсткае абыходжанне з Марыяй Калеснікавай, адвольнае затрыманне і неабгрунтаваны судовы пераслед і прыцягнуць усіх вінаватых да адказнасці ў рамках справядлівага судовага разбіральніцтва***
- ***Пакласці канец злоўжыванням сістэмай крымінальнага правасуддзя ў дачыненні да актывістаў і мірных іншадумцаў.***

*З павагай,*

# ДАДАТКОВАЯ ІНФАРМАЦЫЯ

Знакавая фігура апазіцыі, музыка па асноўнай прафесіі, Марыя Калеснікава стала адным з сімвалаў мірнага пратэстнага руху за правы чалавека ў Беларусі. Яна стала адным з лідараў апазіцыі пасля таго, як Віктар Бабарыка, а таксама іншы кандыдат у прэзідэнты, Сяргей Ціханоўскі, былі арыштаваныя напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 9 жніўня 2020 года. Разам са Святланай Ціханоўскай і Веранікай Цапкала Марыя Калеснікава ўтварыла жаночае трыа, што стала на чале перадвыбарчай кампаніі супраць дзейнага прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі і выклікала масавае пратэстнае галасаванне супраць яго. Вераніка Цапкала пакінула Беларусь 9 жніўня 2020 года, перасцярагаючыся пераследу. Пасля прымусовага выгнання Святланы Ціханоўскай 10 жніўня 2020 года Марыя Калеснікава стала самай вядомай апазіцыянеркай у Беларусі. Яна была на пярэдняй лініі шматлікіх мірных вулічных пратэстаў, неаднаразова выступала супраць жорсткіх дзеянняў з боку сілавікоў, давала шматлікія інтэрв'ю сродкам масавай інфармацыі і працягвала падтрымліваць асобаў, якія падвергліся адвольным арыштам, катаванням і іншых відам жорсткага абыходжання ў месцах пазбаўлення волі.

З кастрычніка 2020 па снежань 2022 года ўлады Беларусі пазбавілі адвакацкай ліцэнзіі трох адвакатаў за тое, што яны прадстаўлялі інтарэсы Калеснікавай: Аляксандра Пыльчанку, Людмілу Казак і Уладзіміра Пыльчанку.

Пасля экстранай аперацыі, праведзенай у лістападзе 2022 года, Марыя Калеснікава правяла каля тыдня ў Гомельскай бальніцы хуткай дапамогі, пасля чаго яе этапавалі ў медсанчастку калоніі. Падрабязнасці пра яе стан здароўя і пра абыходжанне з ёй у штрафным ізалятары сталі вядомыя толькі 5 снежня, калі бацьку дазволілі спатканне з ёй.

Адміністрацыя калоніі 10 студзеня прымусіла Марыю Калеснікаву вярнуцца да працы на швейнай вытворчасці. Сям'я была занепакоеная ў сувязі з тым, што Марыя была яшчэ занадта слабая пасля аперацыі, каб вяртацца ў цэх.

У канцы сакавіка Праваабарончы цэнтр "Вясна" паведаміў, што Марыю Калеснікаву змясцілі ў памяшканне камернага тыпу (ПКТ) — дысцыплінарнае пакаранне, якое прадугледжвае строгі рэжым ізаляцыі, — за нібыта парушэнне правілаў унутранага распарадку.

У траўні 2023 года праваабарончым арганізацыям стала вядома, што Марыя не аднавілася пасля аперацыі і яе стан у турме значна пагоршыўся. Паводле вартых даверу паведамленняў, яна была не ў сілах выконваць абавязковую працу ў калоніі і некалькі разоў губляла прытомнасць. Занепакоеныя пагаршэннем стану Марыі Калеснікавай, сваякі пракансультаваліся з лекарам, высветліўшы патрэбы ў пасляаперацыйнай рэабілітацыі. Хоць лекар не мог асабіста агледзець Калеснікаву, ён рэкамендаваў медычнае назіранне і спецыяльную дыету на працягу яшчэ некалькіх месяцаў пасля аперацыі, каб пазбегнуць рэцыдыву з патэнцыйна значна больш сур'ёзнымі наступствамі для здароўя.

**ПАЖАДАНАЯ МОВА ЗВАРОТУ:** Беларуская, руская, англійская
Вы таксама можаце пісаць на сваёй роднай мове.

**АКЦЫЯ ПІЛЬНАЙ ДАПАМОГІ: 22 жніўня 2023 года**
Калі ласка, звяжыцеся з офісам Amnesty International у вашай краіне, калі вы хочаце адправіць зварот пасля заканчэння акцыі.

**ІМЯ і ПРОЗВІШЧА: Марыя Калеснікава** (яна/яе)

**СПАСЫЛКА НА ПАПЯРЭДНЮЮ АКЦЫЮ ПІЛЬНАЙ ДАПАМОГІ:**
https://www.amnesty.org/en/documents/eur49/3106/2020/en /